УДК 94:332.54(476.6)

# АСАБІСТАЕ ПЫТАННЕ Ў КАМПЕТЭНЦЫІ ЎРАДАВАГА АГРАНОМА ГАРАДЗЕНСКАЙ ГУБЕРНІ Ў 1915 Г.

**Галубовіч В. У., Радзюк А. Г.**

УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Выкананне службовых абавязкаў кіраўніка дзяржаўнай структуры заўжды спалучалася з вырашэннем пытанняў, якія хвалявалі падначаленых. У гэтым сэнсе не з'яўлялася выключэннем і праца ўрадавых аграномаў, якіх сталі прызначаць у Гарадзенскай губерні з 1910 г. У кампетэнцыю ўрадавага агранома ўваходзіла шырокае кола пытанняў, звязаных з каардынацыяй сельскагаспадарчай справы, але найперш гэта быў чыноўнік, які фармаваў штат і адказваў за падпарадкаваных яму людзей. Уласна такі "асабісты" акцэнт і трапіў у цэнтр увагі дадзенага артыкула. Архіўныя дакументы дазваляюць паказаць некаторыя аспекты працы з персаналам апошняга кіраўніка Дэпартамента землябробства Антона Савіча Елянеўскага ў 1915 г.

Матэрыяльная праблема. Урадаваму аграному Гарадзенскай губерні падпарадкоўвалася некалькі дзясяткаў спецыялістаў у галіне сельскай гаспадаркі. На колькі яны былі задаволеныя сваім матэрыяльным становішчам у мірны час, сказаць складана, але пасля пачатку Першай сусветнай вайны сітуацыя, несумненна, пагоршылася. Для ілюстрацыі можна прывесці некалькі лістоў, якія захаваліся ў матэрыялах Дэпартамента земляробства. Так, у лісце з Пружанаў да ўрадавага агранома, датаваным 26 студзеням 1915 г., ад майстра па культуры балотаў і лугаводству П. Казла адзначалася: "*Скрайняя матэрыяльная штомесячная нястача з-за позняга атрымання грошай, прымушае мяне звярнуцца да Вас з пакорнай просьбай: ці не знойдзеце Вы магчымасць, каб пазбегнуць вышэйвыкладзеных абставінаў і перавесці мой гадавы аклад, альбо хаця б па паўгоддзям, на Пружанскае казначэйства, дзе б была магчымасць атрымліваць яго своечасова.*". У вельмі цяжкім становішчы апынуўся на пачатку 1915 г. практыкант Мельнікаў. 12 студзеня 1915 г. А.С. Елянеўскі паведаміў Мельнікаву, што той можа хадайнічаць аб аднаразовай дапамозе на ўтрыманне сваёй сям'і з сродкаў Гарадзенскага часовага камітэта дапамогі чынам Галоўнай управы землеўладкавання і земляробства (далей – ГУЗЗ) і іх сем'ям, а таксама з аналагічнага камітэта ГУЗЗ у сталіцы імперыі. А.С. Елянеўскі таксама асабіста звяртаўся ў Петраградскі камітэт дапамогі сем'ям чыноўнікаў ГУЗЗ, прызваных на вайну, з просьбай аб прызначэнні Мельнікаву ўтрымання памерам 200 рублёў, паколькі практыкант меў вялікую сям'ю – пяць дзяцей, у тым ліку дачку-гімназістку. Па словах А.С. Елянеўскага, сям'я Мельнікава "*засталася без сродкаў існавання, так як практыкант не лічыцца вольнанаёмным служачым і не карыстаецца правам атрымліваць у час вайны частку свайго ўтрымання для сям'і*".

Падтрымка супрацоўнікаў прымяркоўвалася і да святаў. Так, захавалася паведамленне ўрадавага агранома пра тое, што Дэпартамент вылучыў матэрыяльную дапамогу старэйшаму інструктару І. С. Кірухіну да свята Нараджэння Хрыстова ў памеры 75 рублёў.

Асобна варта звярнуць увагу на падтрымку з боку ўрадавага агранома тых супрацоўнікаў, якіх прызвалі ў армію. Так, 5 лютага 1915 г. А. С. Елянеўскі склаў прашэнне ў Дэпартамент адносна майстроў па паляводстве Георгія Мікалаевіча Кавальчука і Уладзіміра Аляксандравіча Легензевіча, якія хадайнічалі аб выдачы ім двухмесячнай аднаразовай дапамогі ў памеры 150 рублёў кожнаму "*як служачым вольнанаёмным і нежанатым*": Кавальчуку на адрас –

Штаб 2-га Армейскага корпуса, а Легензевічу – 643-я Пяхотная валынская апалчэнская дружына.

Іншы былы супрацоўнік Дэпартамента, майстар па паляводству Аляксей Калістратавіч Гаворка, які быў залічаны ў "*флотскую каманду*", у кастрычніку 1915 г. напісаў з Рэвеля свайму былому начальніку ліст (увесь тэкст у дадатках) з просьбай аб пераводзе заробку, дзе ёсць наступныя радкі: "*Увайдзіце Вы ў маё салдацкае становішча, у якім на адно імавернае салдацкае жалаванне пражыць вельмі складана. Бо патрэбна свая капейчына*". Што праўда, яшчэ да атрымання ліста губернскі аграном даслаў камандзіру 4 батальёна марской брыгады паведамленне аб пералічэнні грошай для Гаворкі.

Медычны фактар. Праца з людзьмі прымушала губернскага агранома сутыкацца з тым, што прынята называць "урачэбнай тайнай". Так, 13 лютага 1915 г. малодшы інструктар Ф.М. Казенец адрасаваў з Бельска прашэнне аб адпачынку, падмацаванае медычнымі даведкамі, з такім зместам: "*я маю пільную патрэбу ў працяглым лячэнні ў санаторыі для хворых на нервы, таму маю гонар прасіць Дэпартамент земляробства даць мне на гэтыя мэты працяглы адпачынак і па прычыне таго, што я не маю асабістых сродкаў для лекавання, прызначыць мне для гэтага ўтрыманне на меркаванне Дэпартамента земляробства*". З далучанага да ліста сведчання доктара вынікала, што Фёдар Мітрафанавіч Казінец, які меў 29 гадоў, "*некалькі год хварэе цяжкай формай плечава-мазгавой неўрасценіі (Neurasthaenia cerebro-spinalis), якая прагрэсіўна пагоршваецца, у выніку чаго хвораму неадкладна патрабуецца поўны фізічны і разумовы спакой і лекаванне ў санаторыі для нервовых хворых на працягу, па меншай меры, некалькіх месяцаў*".

Карэкцыя паводзінаў. У абавязкі ўрадавага агранома ўваходзіла адказанасць за ўчынкі супрацоўнікаў, не звязаныя з выкананнем службовых абавязкаў. Справа ў тым, што некаторыя падначаленыя А.С. Елянеўскага дэмастравалі мадэлі паводзінаў, якія не былі прынятыя сярод тагачасных дзяржаўных служачых. Напрыклад, 30 чэрвеня 1915 г. урадавы аграном з Слоніма паведаміў майстру па лугаводстве Лінавіцкаму пра паступленне 13 красавіка 1915 г. на імя начальніка Гарадзенскай Управы земляробства і землекарыстання скаргі, складзенай на Лінавіцкага святаром вёскі Яглевічы Слонімскага павета "*пра тое, што Вы з непавагай ставіцеся да Тайны Прычашчэння, а таксама агітуеце сярод сялянаў, бунтуеце іх супраць святара*". На падставе гэтай скаргі ўрадавы аграном патрабаваў з'яўлення майстра для адпаведных тлумачэнняў. Захаваўся і сам тэкст дакладной святара Якава, напісаны 13 красавіка і атрыманы 20

красавіка ў Гарадзенскай управе. Між іншым тут паведамлялася: “*Майстар па культуры балот Рыгор Антонавіч Лінавіцкі пасля споведзі падчас Вялікага Паста хацеў прыступіць да прыняцця Св. Тайнаў, пакурыўшы і піўшы, але дзякуючы таму, што я сам бачыў яго курыўшым, то не дазволіў зневажання Св. Тайнаў і не дапусціў яго да Прычасця. Пасля другой споведзі я яго прычасціў, але, як апынулася, ён ізноў напіўся гарбаты, што мне стала вядома ўжо пазней. У такім нечуваным учынку Лінавіцкага праглядаецца яго намеранае жаданне зняважыць Свяцейшыя Тайны Прычасця.*

*Акрамя гэтага, ён агітуе сярод прыхаджанаў за тое, каб яны не плацілі святару за трэбы, што плата за пахаванне тры рублі ёсць вельмі вялікай і незаконнай. У цяперашні злы час маральнасць вескі і так стаіць нізка, асабліва сярод моладзі, што ж прынясуць ёй такія ўчынкі і агітацыя? Маё сумленне не дазволіла мне дапусціць Лінавіцкага да Прычасця, за што ён пакрыўдзіўся і зараз у вачох прыхаджанаў ён імкнецца паставіць мяне ў нішто, указваючы на нібы мае назаконныя ўчынкі.*

*Пакорна прашу Ваша Правасхадзіцельства спыніць учынкі і справы сп. Лінавіцкага ад Вас залежнымі сродкамі. Пры гэтым прыкладаю паказанні аднаго з настаўнікаў ў тым, што Лінавіцкі курыў і піў гарбату да Прычасця.*”.

Шлюбнае пытанне. З сучасных перспектываў некаторыя справы, якія знаходзіліся ў кампетэнцыі ўрадавага агранома выглядаюць кур’ёзам, але што было, то было. Так, 17 чэрвеня 1915 г. А.С. Елянеўскі выслаў на імя таго ж майстра па лугаводстве Рыгора Антонавіча Лінавіцкага даведку з наступным зместам: “*паведамляю Вам, што з майго боку няма перашкодаў для заключэння Вашага шлюбу* (а далей ад рукі было дапісана – *з расейскай падданай, хрысціянскага веравызнання, беззаганнай перад судом*)”.

Кантроль за веравызнаннем падначаленых. Пры прыёме новых супрацоўнікаў на працу ўрадавы аграном павінен быў звяртаць увагу не толькі на іх адукацыю, але і веравызнанне. Справа ў тым, што ў той час патрабавалася прадастаўляць для сужбовага выкарыстання ў Дэпартамент земляробства не толькі метрычныя дадзеныя, але і “*пасведчанне аб хросце*”. Падобная даведка была запатрабавана Дэпартаментам 17 чэрвеня 1915 г. ад А.С. Елянеўскага, калі той у нейкай справе прадставіў наверх дадзеныя “*не маючага чыну*” старэйшага інструктара Іллі Кірухіна.

У службовыя абавязкі ўрадавага агранома Гарадзенскай губерні ўваходзіла вырашэнне кадравага пытання і агульная адказнасць за паводзіны і лёс сваіх падначаленых. Гэта вымушала чыноўніка

вырашаць часам вельмі спецыфічныя “асабістыя” пытанні. Праблемы, з якімі сутыкнуўся апошні гарадзенскі ўрадавы аграном, былі ўласцівыя і для мірнага часу, але яны аб’ектыўна ўскладніліся ў перыяд вайны.

ДАДАТАК

*Ліст былога майстра па паляводстве А. К. Гаворкі*
*да губернскага агранома А. С. Еляneўскага*

*Октября 18 дня 1915 года*

*Глубокоуважаемый Антон Савич!*

*Я уже неоднократно писал Вам о высылке мне жалования за июль месяц, но до сих пор его не получил. Быть может, Вы даже и высылали, но мой адрес изменяется часто и не успели ещё прислать по назначению. Если же ещё не высылали, то будьте настолько добры, вышлите немедленно, буду Вам очень и очень благодарен.*

*Войдите Вы в моё солдатское положение, которому за одним мнимым солдатским жалованием прожить очень трудно. Ведь нужна своя копейка. Я сейчас нахожусь на передовых позициях. Хотя эта позиция, где я нахожусь, не особенно опасна, немцы нас редко трогают, а мы злого не затрагиваем и живём пока мирно, как долго будет это продолжаться всецело зависит от немцев. Так что можно ожидать конечный час и каждой минуты, что вот - вот мы вступим в битву с врагом. Живётся пока хорошо. Живу на лоне природы. Кругом леса, поля и могучие морские воды. Вернее, кругом поэзия. У нас зима начинает вступать в свои пределы. Первый снег выпал 8-го октября. Морозы небольшие, хотя здесь, я полагаю, что и не бывает бол[ьших]. С одним трудно и трудно мириться, что нет решительно никакой духовной жизни, а живём, подобно диким зверям в лесу, ничего не знаем, что делается в мире и за что мы бьёмся. Нет и никакого живого печатного слова. Не знаю, иль это нарочно так устроено, иль это само собой образовывается, и никто не подумает побороться против этого.*

*Ну, пока, всяких благ.*

*Бывший мастер по полеводству А. Говорко.*

*Привет всей организации. Адрес мой: г. Ревель, через службу связи Южного района 4-й Батальон морской бригады Сухопутного фронта морской крепости императ. Петра Великаго. 1-я рота, 3 взвод, молодому матросу А.К. Говорко”.*

НГАБ у Гародні. Ф. 361. В. 1. Спр. 25Арк. 288-288 адв.

КРЫНІЦЫ


1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гародні. Ф. 361. Вопіс 1, справа 20.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гародні. Ф. 361. Вопіс 1, справа 25.